# СА СВЯТАМ, РОДНЫ БДУ!

**Выкладчык!
Супрацоўнік!
Студэнт!
Сёння перад табой
паўстане радком
газетным наш
імклівы крок...**

*ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

СПЕЦВЫПУСК, ПРЫСВЕЧАНЫ 60-ГОДДЗЮ УНІВЕРСІТЭТА

№ 1—2 (1339—1340)

1982

**ВАШЫМ, ТАВАРЫШ,
СЭРЦАМ
І ІМЕМ
ДУМАЕМ, ДЫХАЕМ,
ЗМАГАЕМСЯ І ЖЫВЁМ!**

## *Мы сэрцам з Леніным заўсёды*

*Не памыліліся
ў асноўным —
Мы сэрцам з Леніным
жылі.*

**Пятрусь БРОЎКА,**
**выпускнік 1931 года**

*Месца маё ў свеце —
Месца ў сэрцы тваім.*

**Анатоль ВЯРЦІНСКІ,**
**выпускнік 1956 года**

*Ляцець трывожнаму пяру
Пад стрэсам, пад
аблогай...
Як знаць: з табою гавару
Ці з цэлаю эпохай?*

**Яўгенія ЯНІШЧЫЦ,**
**выпускніца 1971 года**

*Ён святлом дзяліцца
рады,
Толькі хоча, каб святло
Стала завяззю спагады,
Дабратою прарасло.*

**Сяргей ЗАКОННІКАЎ,**
**выпускнік 1969 года**

## І ЛІЧБЫ ПЕСНЯЙ ГУЧАЦЬ...

● За 60 гадоў універсітэт падрыхтаваў каля 60 тысяч высокакваліфікаваных спецыялістаў.

● Сёння ва універсітэце займаецца каля 18 тысяч студэнтаў. З іх 9500 — на дзённым аддзяленні.

● На 12 факультэтах універсітэта вядзецца падрыхтоўка па 17 спецыяльнасцях і 74 спецыялізацыях.

● У аспірантуры па 83 спецыяльнасцях навучаюцца каля 600 аспірантаў, пры кафедрах налічваецца каля 900 спаборнікаў на атрыманне вучонай ступені.

● Партыйная арганізацыя — палітычны авангард калектыву універсітэта. У яе радах звыш 1700 камуністаў. З 1980 года партком працуе на правах раённага камітэта КПБ.

● Моладзь выхоўваюць 335 удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. У іх ліку тры Героі Савецкага Саюза.

● Навуковую і навукова-педагагічную работу на 105 кафедрах вядуць 145 дактароў навук, у тым ліку 47 акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў АН СССР і АН БССР, каля 900 дацэнтаў і кандыдатаў навук, 40 лаўрэатаў Ленінскай і Дзяржаўных прэмій СССР, БССР і прэмій Ленінскага камсамола.

● Эканамічны эфект ад укаранення навуковых дасягненняў БДУ ў народную гаспадарку ўзрос за гады X пяцігодкі ў 10 разоў і дасягнуў толькі ў 1980 годзе 22,3 мільёна рублёў.

● За гады дзесятай пяцігодкі атрымана 640 аўтарскіх пасведчанняў і патэнтаў, у тым ліку толькі ў 1980 годзе больш чым 200.

● Супрацоўнікамі БДУ за пяцігодку абаронена 12 доктарскіх і 250 кандыдацкіх дысертацый, у тым ліку толькі ў 1980 годзе — 70.

● Навукова - даследчай работай займаюцца 79 працэнтаў студэнтаў.

● Універсітэтам заключана звыш 150 дагавораў аб супрацоўніцтве з прадпрыемствамі і ўстановамі рэспублікі, створана 5 філіялаў кафедр у інстытутах АН БССР і на прамысловых прадпрыемствах.

● За дзесятую пяцігодку універсітэт тройчы выходзіў пераможцам Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва сярод ВНУ краіны і ўзнагароджваўся пераходным Чырвоным сцягам ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ і двойчы запар — у 1979 і 1980 гадах — пераходным Чырвоным сцягам Мін-ВНУ СССР і ЦК галіновага прафсаюза. Такой жа ўзнагароды ўдастоены ў 1980 годзе навукова-даследчы інстытут прыкладных фізічных праблем імя А. Н. Сеўчанкі.

У. А. БЕЛЫ, рэктар Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, віцэ-прэзідэнт АН БССР, акадэмік АН БССР.

# ШЛЯХАМ ВЕДАЎ І АДКРЫЦЦЯЎ

Споўнілася 60 гадоў з дня заснавання Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Сам факт стварэння Белдзяржуніверсітэта з'явіўся вынікам тытанічнай і плённай рэвалюцыйна - аднаўленчай дзейнасці Камуністычнай партыі, тых гіганцкіх сацыяльных зрухаў, якія адбыліся ў нашай краіне пад яе кіраўніцтвам пасля перамогі Вялікага Кастрычніка.

Ужо з першых крокаў Савецкай улады, у надзвычай цяжкія гады разрухі, ва ўмовах жорсткай барацьбы са знешнімі і ўнутранымі ворагамі воляй партыі, усяго працоўнага народа вышэйшая адукацыя і навука як важны фактар пераўтварэння грамадства на камуністычных асновах былі ў нашай краіне ўзведзены ў ранг палітыкі і практыкі асобай дзяржаўнай важнасці. Белдзяржуніверсітэт — адно са звенняў вышэйшай школы сацыялістычнай Айчыны — нарадзіўся і мацнеў у плыні гіганцкіх гістарычных пераўтварэнняў, на грэбні магутнага рэвалюцыйнага энтузіязму шырокіх народных мас, які быў выкліканы грандыёзнасцю планаў Краіны Саветаў, практычным здзяйсненнем выпрацаванай Леніным праграмы культурнай рэвалюцыі.

На працягу шасці дзесяцігоддзяў універсітэт адчуваў і адчувае пастаянную ўвагу і клопат нашай партыі і ўрада аб развіцці вышэйшай школы, аб яе супрацоўніках, якія ўсё больш садзейнічаюць памнажэнню навукова-тэхнічнага патэнцыялу, умацаванню эканомікі, павышэнню інтэлектуальных, агульнакультурных каштоўнасцей савецкага народа; аб людзях вялікага таленту і шырокай эрудыцыі, акрыленых самымі высокімі думкамі і імкненнямі, ахопленых ідэяй служэння Радзіме, беззапаветна адданых справе Камуністычнай партыі і савецкага народа.

Цяпер, з вышыні дасягнутага, азіраючыся на вытокі Белдзяржуніверсітэта, здзіўляешся, якой сапраўды прадбачлівасцю трэба было валодаць у той час, каб у параўнальна невялікай рэспубліцы, якая тады яшчэ толькі-толькі пачынала пазбаўляцца ад суцэльнай непісьменнасці, ад векавой адсталасці і галечы, закласці трывалую аснову вышэйшай адукацыі і навукі, вызначыць далёкую перспектыву і ўсё ўзрастаючую ролю універсітэта ў будучым.

60-годдзе Белдзяржуніверсітэта — знамянальная падзея ў грамадска-палітычным, духоўным жыцці ўсяго беларускага народа. Універсітэт, які з'яўляецца дзецішчам ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі, адыграў вялікую ролю ў развіцці сацыялістычнай беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці, навукі, культуры. Удумайцеся ў такія рэальныя факты: на аснове БДУ выраслі медыцынскі і педагагічны інстытуты, інстытут народнай гаспадаркі. Ён актыўна ўдзельнічаў у стварэнні Акадэміі навук Беларусі і рэспубліканскай бібліятэкі імя У. І. Леніна. За шэсць дзесяцігоддзяў універсітэцкія дыпломы атрымалі каля 60 тысяч спецыялістаў — людзей высокаадукаваных, дастойных нашай эпохі, сапраўдных арганізатараў і выхавацеляў мас, якія ў дасканаласці валодаюць асновамі навук, энцыклапедычнасцю ведаў, якія вызначаюцца глыбокай камуністычнай перакананасцю і высокімі маральнымі якасцямі, патрыётаў і інтэрнацыяналістаў, плённа працуючых на розных участках камуністычнага будаўніцтва. Многія выхаванцы універсітэта сталі вядомымі партыйнымі і дзяржаўнымі дзеячамі, выдатнымі вучонымі, пісьменнікамі, работнікамі асветы і культуры. Сярод выпускнікоў БДУ 5 Герояў Савецкага Саюза, 9 Герояў Сацыялістычнай Працы, 10 лаўрэатаў Ленінскай прэміі, звыш 200 заслужаных дзеячаў навукі, вышэйшай школы, заслужаных настаўнікаў, дзеячаў навукі і тэхнікі, больш за 100 лаўрэатаў Дзяржаўных прэмій і прэмій Ленінскага камсамола.



Вялікая роля БДУ ў росквіце духоўнага жыцця рэспублікі, у стварэнні сацыялістычнай па зместу, нацыянальнай па форме і інтэрнацыяналісцкай па сваёй сутнасці культуры беларускага народа. Бо з універсітэтам звязаны лёс такіх класікаў беларускай літаратуры, як Якуб Колас і Пятрусь Броўка, Кандрат Крапіва і Іван Мележ і многія іншыя.

А якое яркае сузор'е вучоных выхаваў універсітэт! Гэта лаўрэаты Ленінскай прэміі акадэмік АН СССР Л. А. Арцымовіч, акадэмік АН СССР М. А. Барысевіч, акадэмік АН БССР В. П. Платонаў, доктар хімічных навук Н. Я. Брэжнева, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР акадэмік АН БССР Ф. І. Фёдараў і многія-многія іншыя.

Мы пастаянна памятаем, што універсітэты заўсёды стаялі, стаяць і будуць стаяць на вяршыні піраміды вышэйшай адукацыі, адказваюць за інтэлектуальны патэнцыял рэспублікі і рэгіёнаў краіны. Вось чаму, якую б галіну народнай гаспадаркі краіны мы ні ўзялі, усюды з гонарам можна гаварыць, што выпускнікі БДУ ўнеслі велізарны ўклад, усюды яны ў ліку першых ці першыя.

Сваё свята універсітэт сустракае поспехамі ва ўсіх аспектах сваёй шматграннай дзейнасці. На дванаццаці факультэтах навучаецца каля 18 тысяч студэнтаў. Вучэбны працэс забяспечваюць 105 кафедр, на якіх працуюць 145 дактароў навук, прафесараў, у тым ліку 47 акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў АН СССР і АН БССР, каля 900 дацэнтаў і кандыдатаў навук, 40 лаўрэатаў Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій, прэмій Ленінскага камсамола, звыш 30 заслужаных дзеячаў навукі, вышэйшай школы, навукі і тэхнікі. Сённяшняму пакаленню студэнтаў ёсць у каго пераймаць вопыт, веды, навыкі, ёсць з каго браць прыклад, на каго раўняцца.

Ва універсітэце паспяхова спалучаецца падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў з інтэнсіўнай навуковай дзейнасцю. Эфектыўнасць навуковых даследаванняў асабліва ўзрасла за гады дзесятай пяцігодкі. Вучонымі універсітэта выдадзена больш за 900 манаграфій, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, апублікавана больш 11 тысяч навуковых артыкулаў, атрымана 640 аўтарскіх пасведчанняў, прычым толькі ў 1980 годзе больш за 200. Эканамічны эфект ад укаранення навуковых даследаванняў у народную гаспадарку за гады дзесятай пяцігодкі ўзрос у 10 разоў і дасягнуў толькі ў 1980 годзе 22,3 мільёна рублёў. За гэтымі лічбамі—смелы пошук, нястомная работа! Трэба адзначыць, што ўпершыню ў гісторыі вышэйшай школы рэспублікі ў 1979 годзе універсітэту ўручана пасведчанне на навуковае адкрыццё, зробленае выпускніком БДУ прафесарам У. Р. Барышэўскім. Гэта яшчэ раз пацвярджае, што універсітэты заўсёды былі, ёсць і будуць калыскай фундаментальных даследаванняў.

Важным аспектам у шматграннай дзейнасці універсітэта з'яўляецца падрыхтоўка навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі не толькі для сябе, але і для абсалютнай большасці ВНУ і навуковых цэнтраў рэспублікі, і ў першую чаргу па марксісцка-ленінскай філасофіі, асновах навуковага камунізму, гісторыі КПСС, філалогіі, матэматыцы, фізіцы, хіміі, біялогіі і іншых фундаментальных навуках. Дастаткова сказаць, што толькі ў 1981 годзе больш за 100 аспірантаў і маладых супрацоўнікаў БДУ паспяхова абаранілі дысертацыі. Такіх вынікаў не ведала гісторыя універсітэта.

Сёння да нас у Беларусь, якая ўсяго 60 гадоў назад сама была малаадукаванай, едуць па веды маладыя пасланцы больш чым з 60 краін амаль усіх кантынентаў планеты.

І мы можам ганарыцца, што замежныя студэнты атрымліваюць у нас не толькі глыбокія веды, але і асновы марксісцка-ленінскага светапогляду, аб чым сведчыць іх праца на высокіх пастах дзяржаўнай, вытворчай, ідэалагічнай і навуковай дзейнасці ў краінах, адкуль яны былі пасланы.

Асобая роля ў справе падрыхтоўкі выпускнікоў універсітэта і развіцці перш за ўсё фундаментальных навуковых даследаванняў належыць Акадэміі навук БССР. Вучоныя з акадэміі чытаюць лекцыі, кіруюць дыпломнымі работамі, аспірантамі, шчодра перадаюць свае веды і вопыт студэнтам і маладым вучоным БДУ.

За ўсе гэтыя дасягненні і поспехі мы павінны ў першую чаргу аддаць даніну павагі нашым ветэранам, якія ўсё сваё жыццё звязалі з універсітэтам, аддаюць яму ўсе свае веды, вопыт і сілы. Сёння цяжка пераацаніць іх уклад у слаўную гісторыю БДУ. Ва універсітэце паспяхова працуюць сотні ветэранаў вайны, якія свае ратныя подзвігі працягваюць на высакароднай ніве адукацыі, навукі і культуры. Пашана і хвала ім, падзяка ад усяго калектыву універсітэта!

І канешне ж, 60-годдзе універсітэта — гэта свята нашай моладзі, маладых вучоных, аспірантаў, студэнтаў, якія захоўваюць і памнажаюць лепшыя традыцыі універсітэта. Іменна яны пераступяць парог XXI стагоддзя і дастойна выкарыстаюць атрыманыя сёння веды ва ўсіх сферах сваёй дзейнасці. Іх талент, энтузіязм, гатоўнасць працаваць там, дзе неабходна Радзіме, — залог усіх поспехаў.

Адметная ўся гісторыя Беларускага дзяржаўнага універсітэта, але дзякуючы клопатам партыі і ўрада яго будучыня яшчэ больш цудоўная. У адпаведнасці з рашэннямі XXVI з'езда КПСС пастаянна ўдасканальваецца якасць падрыхтоўкі выпускнікоў, паспяхова развіваюцца навуковыя даследаванні, больш цеснай і плённай становіцца сувязь з вытворчасцю, развіваецца матэрыяльна-тэхнічная база БДУ. Мы будзем будаваць не толькі новыя цудоўныя вучэбныя і навукова-даследчыя карпусы, але і школу для таленавітых дзяцей, спартыўныя комплексы, маладзёжны клуб, Дом вучоных і многае іншае. Абавязкова будзем будаваць!

Таварыш Л. І. Брэжнеў гаварыў: «Будучае не знаходзіцца за межамі сучаснага. Будучае закладзена ў сучасным, і вырашаючы задачы сённяшняга— сацыялістычнага дня, мы паступова ўступаем у дзень заўтрашні — у дзень камуністычны». Памятаючы заўсёды аб гэтым, калектыў універсітэта накіраваны ў будучае. Усімі сваімі планамі, канкрэтнымі справамі і поспехамі па выкананню рашэнняў гістарычнага XXVI з'езда КПСС шматтысячны калектыў Белдзяржуніверсітэта нястомна набліжае дзень заўтрашні.

# ТРЫВАЛАЯ АСНОВА

ЛЮБОЎ да хіміі, якую я пранесла праз усё жыццё, зарадзілася ў невялікай аўдыторыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Гэта было ў 1923 годзе, калі я пачала вучыцца. Тады БДУ мала чым нагадваў сённяшні універсітэт. Аўдыторыі былі раскіданы па ўсім горадзе, які быў мала чым падобны на сучасны Мінск. Студэнты пешшу хадзілі з аднаго канца горада ў другі. Лабараторыі былі маленькімі, бедна абсталяванымі, але вялікая цяга да ведаў і цудоўныя лекцыі прафесараў М. А. Прыляжаева, Б. М. Беркенгейма і дацэнта М. Ф. Ярмоленкі з'явіліся асновай для атрымання добрай падрыхтоўкі ў галіне хіміі.

**Н. БРЭЖНЕВА, выпускніца універсітэта 1927 года, загадчыца лабараторыі прыкладной радыяхіміі АН СССР, лаўрэат Ленінскай прэміі, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі РСФСР.**

# КАНТЫНЕНТЫ ЎДЗЯЧНЫ БДУ

### «ЗАЎСЁДЫ БУДЗЕМ ПАМЯТАЦЬ...»

*НГУЕН ДОНГ-ІЕН (В'етнам), выпускнік механіка-матэматычнага факультэта 1981 года:*

— Назаўсёды запомняцца мне цудоўная Беларусь, выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта, мае сябры. Гэта яны дапамаглі зразумець, што такое сапраўднае сяброўства, верныя таварышы. На сваёй радзіме мы будзем садзейнічаць умацаванню дружбы в'етнамскага і савецкага народаў.

### «ДЗЯКУЙ ЗА ВЕДЫ, УВАГУ, КЛОПАТ...»

*ДАНКА ЛАШКОВА (Балгарыя), выпускніца факультэта прыкладной матэматыкі 1981 года:*

— Пяць гадоў, запоўненых вучобай і клопатамі, праляцелі як пяць імгненняў. Дзякуй за ўвагу, веды, клопат і чуласць, дарагія савецкія сябры! Жадаю ўсім выпускнікам добрага шляху!

### «СТАЛІ САПРАЎДНЫМІ ПАМОЧНІКАМІ»

*АБДУЛ ДЫАЛО (Гвінея), выпускнік фізічнага факультэта 1981 года:*

— Самыя лепшыя ўражанні ў мяне застануцца пра Мінск, універсітэт, фізічны факультэт. Выкладчыкі і савецкія студэнты былі найлепшымі сябрамі і дарадчыкамі, дапамагалі заўсёды і ва ўсім.

### «УЗРОВЕНЬ ВЫСОКІ»

*АНДРЭАС (ГДР), выпускнік фізічнага факультэта 1981 года:*

— У БДУ я меў шырокія магчымасці для творчай работы і магу смела сказаць, што ўзровень адукацыі тут вельмі высокі.

# І ЛІЧБЫ ПЕСНЯЙ ГУЧАЦЬ...

● Ва універсітэце набываюць веды каля 800 замежных студэнтаў, пасланцоў больш чым з 60 краін Еўропы, Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі. За дваццаць гадоў універсітэт закончылі 4,5 тысячы замежных грамадзян з 83 краін свету, 60 з іх абаранілі кандыдацкія дысертацыі.

● За паспяховую падрыхтоўку спецыялістаў урад Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам узнагародзіў універсітэт ордэнам Дружбы СРВ.

● За дасягненне высокіх поспехаў у падрыхтоўцы кадраў для Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі гэтай краіны ўзнагародзіла універсітэт Ганаровай граматай.

● З кожным годам мацнеюць сувязі універсітэта з ВНУ сацыялістычных краін. Заключаны дагаворы аб навуковым і культурным супрацоўніцтве з ВНУ НРБ, ПНР, ГДР, Кубы, СРВ, СФРЮ.

● Звыш 21325 тысяч чытачоў абслугоўвае фундаментальная бібліятэка Белдзяржуніверсітэта, кніжны фонд якой складае амаль 2 мільёны экземпляраў.

*Тысячы студэнтаў штодзённа запаўняюць аўдыторыі БДУ.*

● УНІВЕРСІТЭТ — НАРОДНАЙ ГАСПАДАРЦЫ

# АЎТАРЫТЭТ НАВУКІ

Магістральны шлях паляпшэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, павышэння аддачы навукі і развіцця структуры вышэйшай школы як сістэмы заключаецца ў адзінстве навукі і адукацыі, у гарманічным узаемадзеянні навуковых даследаванняў з вучэбна-выхаваўчым працэсам.

У Справаздачным дакладзе ЦК КПСС XXVI з'езду партыі Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў указаў на неабходнасць больш поўнага выкарыстання навуковага патэнцыялу ВНУ, у якіх сканцэнтравана амаль палова ўсіх дактароў і кандыдатаў навук. Усведамляючы важнасць гэтай задачы, калектыў ардэнаноснага Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна ўносіць дастойны ўклад у яе рашэнне.

Спецыфіка навуковай дзейнасці флагмана вышэйшай школы рэспублікі — гэта спалучэнне фундаментальных і прыкладных навуковых работ. Сёння 4/5 фундаментальных даследаванняў праводзяцца па важнейшай тэматыцы.

За пяцігодку вучонымі універсітэта атрыманы 640 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходніцтвы. Толькі ў 1980 годзе 18 з 19 укаранёных распрацовак, накіраваных на стварэнне новых машын, апаратаў, прылад, матэрыялаў і новых тэхналагічных працэсаў, абаронены 57 аўтарскімі пасведчаннямі. Ужо сёння 65 працэнтаў усіх прыкладных даследаванняў універсітэта выконваюцца на ўзроўні вынаходніцтваў. Мы маем права ганарыцца нашымі вучонымі-вынаходнікамі, сярод якіх дырэктар НДІ фізіка-хімічных праблем, член-карэспандэнт АН БССР, прафесар В. В. Свірыдаў, прафесар У. Р. Барышэўскі, дацэнт В. Я. Ямны і іншыя.

Пастаянна расшыраюцца сувязі універсітэта з прамысловымі прадпрыемствамі. Штогадовы аб'ём гасдагаворных даследаванняў перавысіў 8 млн. рублёў. Акрамя прамысловых прадпрыемстваў і арганізацый рэспублікі, геаграфія навуковых сувязей універсітэта распаўсюджваецца сёння ад Ленінграда да Далёкага Усходу. Дасягнуты значныя вынікі ў распрацоўцы спецыяльных прылад і сродкаў радыёэлектронікі, мікраэлектронікі, асабліва дакладных сродкаў вымярэння і тэхнічнай дыягностыкі, фотахіміі і хіміі высокамалекулярных злучэнняў. У прыватнасці, вучонымі універсітэта распрацаваны і створаны мабільныя лідарныя станцыі для дыстанцыйнага кантролю аэразольных забруджванняў атмасферы метадам лазернай лакацыі. Іх прымяненне дазваляе пазбавіцца ад працаёмкіх і дорагакаштуючых вымярэнняў чысціні атмасфернага паветра з выкарыстаннем радыёзондаў.

Распрацаваны і ўкаранёны на Мінскім заводзе «Цеплаізадэталь» новы тэхналагічны працэс атрымання высокаэфектыўных цеплаізаляцыйных матэрыялаў (фенапенапластаў) з адходаў нафтаперапрацоўчай прамысловасці з эканамічным эфектам больш чым 240 тысяч рублёў у год.

Атрымана вопытная партыя тэкстыльных вырабаў з гідратцэлюлознага валакна, распрацаванага па прагрэсіўнай бессеравугляроднай тэхналогіі. І шмат іншага.

Поспехі універсітэцкай навукі — гэта, у першую чаргу, сплаў вопыту ветэранаў і творчага пошуку маладых. Сёння савет маладых вучоных універсітэта аб'ядноўвае звыш 1200 спецыялістаў.

Адной з новых эфектыўных форм інтэнсіфікацыі вучэбнага працэсу, максімальнага набліжэння яго да рэальных умоў вытворчасці з'яўляецца стварэнне вучэбна-навукова-вытворчых аб'яднанняў. У 1976 годзе створана і паспяхова функцыянуе ВНВА «БДУ імя У. І. Леніна — ВА «Інтэграл», у рамках якога праходзяць падрыхтоўку студэнты радыёфізічнага, фізічнага і хімічнага факультэтаў і выконваюцца сумесныя навуковыя даследаванні. За гады работы ў ВНВА прайшло падрыхтоўку звыш 1000 студэнтаў. Адной з новых форм арганізацыі гэтых аб'яднанняў з'явілася адкрыццё непасрэдна на вытворчасці базавых кафедр фізікі паўправаднікоў і радыётэхнікі і фізічнай электронікі, што паслужыць далейшай эфектыўнай садружнасці ВНУ з вытворчасцю.

Комплексная арганізацыя навукі ў наш час будуецца на прынцыпах адзінай сацыяліс-тычнай кааперацыі і інтэграцыі. Навуковыя даследаванні па дагаворах аб навуковым і і культурным супрацоўніцтве выконваюцца з ВНУ ГДР, Польшчы, Балгарыі, Югаславіі, Кубы. Вынікі сумесных даследаванняў абагульняюцца ў манаграфіях, навуковых зборніках, укараняюцца ў вучэбны працэс.

На рубяжы нашага 60-годдзя мы нацэлены ў заўтра. Іменна там, на парозе XXI стагоддзя нас чакаюць новыя адкрыцці і здзяйсненні тых, хто сёння толькі ўпершыню пераступіў парог універсітэцкай аўдыторыі, каму працягваць эстафету слаўных працоўных спраў старэйшага пакалення, памнажаць добрыя традыцыі старэйшай ВНУ рэспублікі. Іменна ў гэтай пераемнасці мы бачым сённяшнія і будучыя рубяжы універсітэцкай навукі.

**І. ЗЯЦЬКОЎ,**
**прарэктар па навуковай рабоце, дацэнт.**

**Мы в грёзах пустых**
**не витаем,**
**природы подарков не**
**ждём,**
**мы новое изобретаем,**
**мы будущее создаём.**

## І ЛІЧБЫ ПЕСНЯЙ ГУЧАЦЬ...

● У саставе БДУ, акрамя агульнаўніверсітэцкай навукова-даследчай часткі,— 2 навукова-даследчыя інстытуты, 11 праблемных і галіновых лабараторый, вылічальны цэнтр, спецыяльнае канструктарска-тэхналагічнае бюро з доследнай вытворчасцю, фундаментальная бібліятэка і тры музеі.

● У 1980 годзе па выніках Усесаюзнага конкурсу студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя заняла першае месца ў краіне.

● У перадсвяточныя дні адкрыты навукова-метадычная выстаўка і музей гісторыі універсітэта. Шырокую экспазіцыю прадставіў універсітэт на ВДНГ БССР.

● СТУДЭНТ І НТП

# СТУДЭНЦКІЯ МІЛЬЁНЫ

Аб прыхільнасці маладых да навуковага пошуку сведчыць ужо той факт, што сёння ў БДУ імя У. І. Леніна рознымі формамі навуковай работы ахоплена 79 працэнтаў студэнтаў дзённай формы навучання. І калі эканамічны эфект, атрыманы ў выніку ўкаранення распрацовак студэнцкага навуковага таварыства ў 1980 годзе склаў 1249 тысяч рублёў, то з чым можна параўнаць той уплыў, які аказвае масавае далучэнне студэнтаў да навукова-даследчай работы на выхаванне будучага спецыяліста, кіраўніка, вучонага.

У апошні час многа гавораць пра якасны бок ведаў, пра ўменне самастойна працаваць, арыентавацца ў бязмежным акіяне навукова-тэхнічнай і грамадска-палітычнай інфармацыі, правільна разумець задачы, што стаяць перад сённяшняй навукай і вытворчасцю. А гэтыя якасці, як вядома, прывіваюцца і выкрышталізоўваюцца перш за ўсё ў студэнцкія гады.

Студэнт I ці II курса (адным словам, той, хто нядаўна пераступіў парог універсітэта) мае свежыя, нешаблонныя думкі. Ёсць ідэі, ёсць жаданне працаваць, шукаць. Адсутнічае толькі адно — і галоўнае — веды. Вось тут і прыходзіць на дапамогу савет па НДРС. Спачатку можна запісацца ў студэнцкі навуковы гурток (іх у БДУ больш за 120), а з трэцяга курса стаць членам студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі (СНДЛ). Дарэчы, па выніках Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх навуковых аб'яднанняў студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя БДУ заняла першае месца ў краіне.

Зараз СНДЛ універсітэта аб'ядноўвае 15 кафедральных навукова-даследчых лабараторый на шасці факультэтах. У іх працуюць 582 студэнты. Займаючыся ў лабараторыі, яны не толькі паглыбляюць свае веды па будучай спецыяльнасці, але, што мае немалаважнае значэнне, авалодваюць навыкамі самастойнай працы.

СНДЛ кафедры радыёфізікі і электронікі звышвысокіх частот адметная. Адметнасць гэта ў тым, што лабараторыя — старэйшая ў БДУ. Гэта па-першае. Па-другое, узначальвае яе з дня стварэння кандыдат тэхнічных навук У. І. Мікуловіч, вучоны, адданы рабоце з творчай моладдзю, лепшы кіраўнік НДРС на факультэце. Лабараторыя была заснавана ў 1967 годзе. Работы, выкананыя пад кіраўніцтвам Уладзіміра Іванавіча, неаднойчы адзначаліся прызамі рэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсаў. Сёння члены лабараторыі распрацоўваюць апаратуру для аналізу вібрацыі механічных сістэм. Толькі ў 1980 годзе эканамічны эфект ад выкананай работы склаў 330 тысяч рублёў.

**А. НІКІЦЕНКА,**
**начальнік СКБ, намеснік старшыні савета па НДРС.**

*Лаўрэаты прэміі Ленінскага камсамола Беларусі: загадчык аддзела сродкаў аўтаматызацыі навуковых даследаванняў, кандыдат фізіка-матэматычных навук М. І. Дзямчук, старшы навуковы супрацоўнік М. П. Цвірко, загадчык лабараторыі аналагалічбавых метадаў вымярэння, кандыдат тэхнічных навук І. А. Малевіч.*

● РЭПАРТАЖ

# ДЫЯЛОГ З ЭВМ

У апошні час прыказку «яйкі курыцу не вучаць» усё часцей ужываюць з мэтай яе тут жа абвергнуць.

Вось і ў нашым выпадку: чалавек стварыў машыну, навучыў яе думаць. І цяпер яна — дзіця людскога розуму — вучыць чалавека.

Сапраўды, скажаце, няўжо сканструявалі робата-выкладчыка?

«ЭВНС»—гэта не робат, а эксперыментальная вылічальная навучаючая сістэма, створаная ва універсітэце на базе «Мінск-32».

Клас «ЭВНС» у час заняткаў нечым нагадвае бясшумнае машыннае бюро. Студэнты — сёння гэта пяцікурснікі ФПМ — працуюць за спецыяльнымі пультамі з клавіятурай, светавым пяром і невялічкім экранам. Зялёныя рухомыя, бы жывыя, паяўляюцца на ім літары, лічбы, словы — тыя, што «дыктуе» чалавек, і тыя, што шле ў адказ машына.

Так адбываецца дыялог з ЭВМ.

Няхай толькі не здасца недасведчанаму, што весці яго вельмі проста. Каб машына «прыняла да выканання» нават звычайнае квадратнае ўраўненне, трэба запісаць яго зразумелымі для ЭВМ сімваламі — інакш кажучы, перавесці на спецыяльную мову праграмірання ФАРТРАН, якую, дарэчы, таксама вывучаюць у класе «ЭВНС».

Але вы заўважылі: ЭВМ тут усяго толькі стаіць у шэрагу тэхнічных сродкаў, нібы апошні член геаметрычнай прагрэсіі, усе папярэднікі якога памнажаліся на дасягненні часу. Ці можа яна прэтэндаваць на ролю выкладчыка?

Відаць, не, бо колькі ні ўдасканальвай лагарыфмічную лінейку, з яе ніколі не атрымаеш педагога.

— Так і тут, — пацвярджае нашу думку загадчык класа «ЭВНС» А. В. Лебедзеў. — Наша навучаючая сістэма ўсяго толькі памочнік выкладчыка.

Вядома, працэнт засваення студэнтам матэрыялу залежыць ад працэнта ўвагі да яго выкладчыка. Звычайна больш эфектыўныя заняткі не ў масавай аўдыторыі, а ў невялічкай групе.

Гэта значыць, існуе аптымальны варыянт: студэнт адзін на адзін з выкладчыкам. Вядома таксама, што такую ўмову забяспечыць нерэальна і немагчыма. Вось тут і ўзнікае патрэба ў такім памочніку, як «ЭВНС». На адным з рабочых узроўняў ЭВМ закладваюцца універсальныя праграмы па вызначаных тэме або прадмету (не толькі матэматыцы, але і фізіцы, хіміі, замежных мовах і інш.). З дапамогай «ЭВНС», звязанай з ЭВМ, у класе можна праводзіць практычныя заняткі, выніковы кантроль ведаў, а таксама саманавучанне студэнтаў. Студэнт адзін на адзін з ЭВМ.

Машына задасць пытанне, зробіць адпаведную падказку, вылавіўшы з глыбінь сваёй фенаменальнай памяці патрэбную даведку-інфармацыю, укажа на правільнасць або памылковасць адказу. Здараецца, што на экране паяўляецца і такая парада: «Звярніцеся да выкладчыка».

«ЭВНС», створаная ў 1975 годзе супрацоўнікамі кафедры электронных матэматычных машын, за гэты час правяла са студэнтамі БДУ 56550 чалавека-гадзін заняткаў.

Цяпер ва універсітэце вядуцца работы па стварэнню тыпавога комплексу тэхнічных сродкаў, сумяшчальнага з сістэмай вучэбнага тэлебачання і арыентаванага на Адзіную сістэму ЭВМ. На факультэце радыёфізікі і электронікі ўкараняецца аўтаматызаваная тэлевізійная навучаючая сістэма, на ФПМ —клас дысплея.

Што ж, дыялог становіцца больш змястоўным, узаемаўзбагачальным. Прыпомніце адзін яго радок: калі ідуць заняткі ў класе «ЭВНС» і на пультах гараць зялёныя агеньчыкі, адной з самых прыемных і жаданых машынных каманд паяўляецца лаканічнае:

— Працягвайце работу.

**А. ЦІХАНОВІЧ,**
**наш кар.**

**На здымку:** у класе «ЭВНС».

# Рапартуем святу

Святкуючы 60-годдзе універсітэта, калектыў БДУ з гонарам рапартуе аб тым, што павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы першага года XI пяцігодкі, накіраваныя на далейшае паляпшэнне якасці прафесійнай падрыхтоўкі, ідэйна-палітычнага выхавання спецыялістаў, усямернае расшырэнне навыковых даследаванняў, павышэнне іх тэарэтычнага ўзроўню і эканамічнага эфекту, з гонарам выкананы. Па ўсіх важнейшых паказчыках дасягнуты больш высокія, у параўнанні з 1980 годам, вынікі.

Узрасла роля Белдзяржуніверсітэта ў сацыяльна-эканамічным і навукова-тэхнічным прагрэсе рэспублікі і краіны, у больш поўным забеспячэнні вядучых галін народнай гаспадаркі высокакваліфікаванымі спецыялістамі. План выпуску спецыялістаў перавыкананы па ўсіх формах навучання і склаў 102,4 працэнта. Больш за 3 тысячы чалавек атрымалі дыпломы аб вышэйшай адукацыі, 186 з іх (6 працэнтаў з ліку выпускнікоў) — з адзнакай. Цяснейшымі задачамі народнай гаспадаркі тэматыка дыпломных работ. 782 з іх рэкамендаваны да ўкаранення і апублікавання.

Эканамічны эфект, які чакаецца ад укаранення распрацовак выпускнікоў БДУ гэтага года толькі па ВА «Інтэграл», — 265 тысяч рублёў. А па матэрыялах даследаванняў пададзены 2 заявы на мэркуемыя вынаходніцтвы.

Паменшыўся адсеў і павысілася бягучая паспяховасць студэнтаў за кошт паляпшэння вучэбна-метадычнай і палітычна-выхаваўчай работы — з аднаго боку, а з другога — за кошт таго, што грамадскія арганізацыі універсітэта сталі больш увагі ўдзяляць прафарыентацыі і прыцягненню на вучобу ў БДУ найбольш здольнай і таленавітай моладзі. Формы гэтай работы пастаянна абнаўляюцца і ўдасканальваюцца.

Работа вучоных універсітэта была накіравана ў 1981 годзе на рашэнне актуальных фундаментальных і прыкладных задач, якія стаяць перад дзяржавай. Даследаванні вяліся па 27 асноўных напрамках, што адпавядаюць спецыяльнасцям, па якіх вядзецца навучанне студэнтаў і падрыхтоўка спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі, а таксама па 114 навуковых напрамках класіфікатара АН СССР.

Прыкметна ўзрос аб'ём работ, якія выконваюцца па важнейшай тэматыцы, колькасць дзяржбюджэтных тэм па якой склала ў 1981 годзе — 127 (у 1980 — 67). Колькасць гасдагаворных тэм, якія выконваюцца па пастанове ўрада і дырэктыўных органаў, склала 65 працэнтаў (у 1980 годзе — 63,3 працэнта).

Універсітэтам і НДІ прыкладных фізічных праблем імя А. Н. Сеўчанкі выкананы цыкл даследаванняў у галіне фізікі цвёрдага цела, у выніку чаго распрацаваны навуковыя асновы накіраванага змянення асноўных уласцівасцей металаў, паўметалаў і паўправаднікоў. Укараненне рэкамендацый радыяцыйнай стойкасці матэрыялаў электроннай тэхнікі на прадпрыемствах дало эканамічны эфект каля 1 млн. рублёў. У галіне аховы навакольнага асяроддзя універсітэтам у рамках дзяржаўнага плана эканамічнага і сацыяльнага развіцця БССР на 1981 год выканана тэма «Паспартызацыя азёр Беларусі», што дазволіла распрацаваць папярэднічаючыя меры і стварыць на унікальных аб'ектах азёрныя заказнікі. Упершыню атрыманы і выкарыстаны для вырашэння гарадабудаўнічых і санітарна-гігіенічных задач буйнамаштабныя картасхемы аэразольных забруджванняў.

У галіне грамадскіх навук сфармуляваны заканамерныя дзеянні сацыяльных і філасофскіх перадумоў, умоў і фактараў у працэсе інтэграцыі сучасных навуковых ведаў. Праведзена абагульненне вопыту работы па сістэматызацыі заканадаўства і падрыхтоўцы рэкамендацый па састаўленню Звода законаў БССР. Выкананы цыкл даследаванняў па раскрыццю сутнасці марксісцка-ленінскага светапогляду, яго пераўтварэння ў кампанент духоўнай культуры і навуковых ведаў.

Пры выкананні падаўляючай большасці тэм выкарыстоўваецца праграмна-мэтавы метад планавання навуковых даследаванняў. Павялічылася колькасць дагавораў аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве і перадачы навукова-тэхнічных дасягненняў.

Калектыў Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна поўны рашучасці дасягнуць яшчэ больш высокіх паказчыкаў у сацыялістычным спаборніцтве.

**Г. МАЦВЕЕЎ,**
**старшыня навукова-вытворчай камісіі мясцкома.**

XI ПЯЦІГОДКА: ГОД ПЕРШЫ

# ІМКЛІВЫ СТАРТ

● **За першы год XI пяцігодкі аспірантамі і супрацоўнікамі універсітэта абаронена звыш 100 дысертацый. Такі рубеж дасягнуты ўпершыню.**

● **Знаначны эфект ад укаранення навуковых даследаванняў дасягнуў за год 23 мільёнаў 517 тысяч рублёў.**

● **Пададзена 408 заяў на вынаходніцтвы. Атрымана 181 аўтарскае пасведчанне, 3 патэнты.**

● **Выдадзена 139 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, 57 манаграфій.**

● **За лета 1981 года СБА асвоіліі 4,4 мільёна рублёў капітальўкладанняў, выступілі з 1543 лекцыямі і 846 канцэртамі мастацкай самадзейнасці.**

## Плён даследаванняў

СВОЕАСАБЛІВЫМ аглядам апошніх дасягненняў у галіне універсітэцкіх даследаванняў сталі 5 перадсвяточных канферэнцый: студэнцкая навуковая, прысвечаная 60-годдзю БДУ імя У. І. Леніна, студэнцкая навуковая канферэнцыя па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху, «Актуальныя праблемы грамадскіх і прыродазнаўчых навук» — канферэнцыя прафесарска-выкладчыцкага саставу, «Навуковая арганізацыя вучэбнага працэсу» — навукова-метадычная канферэнцыя і канферэнцыя маладых вучоных. У 1361 дакладзе прадэманстраваны плён намаганняў 1748 даследчыкаў.

У канферэнцыях удзельнічалі 14 акадэмікаў і 26 членаўкарэспандэнтаў АН БССР. Аўтарамі дакладаў былі 155 дактароў і прафесараў, 529 дацэнтаў, старшых навуковых супрацоўнікаў і кандыдатаў навук, 655 выкладчыкаў без ступені, 471 студэнт.

39 дакладаў было вынесена на пленарныя пасяджэнні.

**Т. САХАЦШЧЫК,**
**наш кар.**

# АД ЛЁСУ РАДЗІМЫ НАШ ЛЁС НЕАДДЗЕЛЬНЫ



*Напярэдадні святкавання 60-годдзя адкрыўся цудоўны музей гісторыі універсітэта. Першыя яго наведвальнікі з цікавасцю знаёмяцца з экспанатамі ў адной з залаў музея.*

● УНІВЕРСІТЭТ У ІХ ЛЁСЕ ● УНІВЕРСІТЭТ У ІХ ЛЁСЕ ● УНІВЕРСІТЭТ У ІХ ЛЁСЕ ● УНІВЕРСІТЭТ У ІХ ЛЁСЕ ●

*І кожны лічыць з іх за гонар,*
*Што быў студэнтам БДУ,*
*Што ў кузні сонечнай ягонай*
*Вучыўся праўдзе і дабру.*

Залаціліся ад сонца дрэвы асеннягагаю. Гаманілі, нібы радавалися святу, што прыйшло на вуліцу Курчатава, у маляўнічы куток на ўскраіку Мінска, гаспадарамі якога некалькі гадоў назад сталі радыёфізікі. У гэты вераснёўскі дзень выпускнікам уручалі дыпломы. Усхваляваным, крыху разгубленым, ім знешне, здавалася, зусім не падыходзіў сур'ёзны надпіс, які стаяў у дыпломах: «...прысвоена кваліфікацыя радыёфізіка».

Прафесар кафедры радыётэхнікі і фізічнай электронікі Ілья Рыгоравіч Некрашэвіч вішнаваў хлопцаў і дзяўчат, жадаў поспехаў. І міжволі ўспомніўся такі ж дзень у яго жыцці. Было гэта даўно — у 1927 годзе. Беларускі універсітэт праводзіў тады ў самастойны працоўны шлях другі выпуск сваіх выхаванцаў. Сярод іх быў і І. Р. Некрашэвіч.

БДУ толькі пачынаў свой шлях. Не хапала прылад, шмат прыходзілася рабіць самім студэнтам. Бяссонныя ночы ў лабараторыях, нейкае незвычайнае натхненне, поўная адданасць любімай справе... Пасля заканчэння БДУ І. Р. Некрашэвіч працягваў вучобу ў аспірантуры пры Маскоўскім універсітэце. Затым вярнуўся ў Мінск і стаў весці навукова-педагагічную работу на родным факультэце.

На працягу цяжкіх гадоў ліхалецця — калі прымаў удзел у падпольнай рабоце групы М. Б. Осіпавай і калі ваяваў у саставе 2-й Мінскай Чырвонапартызанскай брыгады — І. Р. Некрашэвіч насіў зашытую ў кішэні ампулу. Тады неяк не думалася, што гэта можа быць вельмі шкодна. Тая ампула з радыем, як лічыць Ілья Рыгоравіч, была сімвалам шчаслівага жыцця: яно было да вайны, яго са зброяй у руках адстойвалі савецкія людзі.

Баявыя заслугі І. Р. Некрашэвіча адзначаны медалямі «За адвагу», «Партызану Вялікай Айчыннай вайны I ступені», «За перамогу над Германіяй».

Пасля перамогі Ілья Рыгоравіч зноў вярнуўся ва універсітэт.

Сёння яму семдзесят шэсць. Але выглядае Ілья Рыгоравіч значна маладзей. Ён здзіўляе сваёй невычэрпнай энергіяй, бадзёрасцю. «Спадзяёмся, што да наступнага Вашага юбілею мы зноў убачым Вас па-маладому бадзёрым і энергічным, поўным новых планаў і сіл», — так у мінулым годзе, віншуючы І. Р. Некрашэвіча з сямідзесяцігоддзем, напісалі яго былыя вучні — супрацоўнікі кафедры агульнай фізікі.

Навука — заўсёды загадка, тайна, пошук і — адкрыццё. Ілья Рыгоравіч па праву лічыцца родапачынальнікам цэлага шэрагу эксперыментальных напрамкаў фізічных даследаванняў. Больш 160 навуковых прац на рахунку выдатнага фізіка. І высокая ўзнагарода за шматгадовую педагагічную, навуковую і грамадскую работу — ордэн Леніна, званне заслужанага дзеяча навукі БССР.

Калі я спытала ў Ільі Рыгоравіча, якія якасці ён лічыць галоўнымі для сучаснага выкладчыка ВНУ, ён адказаў адразу, коратка, амаль па пунктах:

— Перш за ўсё, гэта захопленасць работай, дасканалае веданне прадмета, пастаянная сувязь тэорыі з практыкай. Трэба паважаць студэнта, адчуваць яго настрой.

Не адну вышыню пакарыў у сваім жыцці І. Р. Некрашэвіч. Таму і не страціў маладога запалу душы, таму і не даюць спакою новыя вышыні.

**Н. ШЧАЛКАНОГАВА,**
**наш кар.**

## За вышынёю — вышыня

...Вайна прыйшла ў той год, калі Беларускі універсітэт рыхтаваўся да свайго дваццацігадовага юбілею. Фашысты занялі Мінск. Палалі, станавіліся руінамі будынкі, нельга было пазнаць знаёмыя плошчы, скверы, вуліцы.

Адной**чы** Ілья Рыгоравіч зайшоў у былы фізічны корпус, які дзівам застаўся цэлы. Нечакана сустрэў выкладчыка Д. Я. Сіроціна. Той працягнуў яму невялікую ампулу з радыем, якую знайшоў сярод звалішчаў у куч**ы** (ста**ў**, рэчаў, прылад. Гэтую ампулу незадоўга да вайны выпісалі з-за мяжы з абсталяваннем, іншымі прэпаратамі. З радыем правадзілася шмат даследаванняў, вывучаліся радыёактыўныя працэсы.

*Шыра кажучы, я ўяўляла не зусім не такой. Мне здавалася, што студэнтка факультэта прыкладной матэматыкі, пяцікурсніца, ленінская стыпендыятка паўнюча быць вельмі сур'ёзнай і строгай. Такой я і чакала ўбачыць Інэсу Раковіч. Але вось яна ўвайшла ў аўдыторыю, і скаванасць першага знаёмства знікла разам з пачаткам нашай гутаркі.*

*— Прафесію матэматыка-праграміста выбрала адразу і без ваганняў. Матэматыку любіла заўсёды, займалася ў школе юнага праграміста. Таму, падаючы дакументы на факультэт прыкладной матэматыкі, мела ўяўленне аб сваёй будучай спецыяльнасці. Ва універсітэт прыйшла пасля сярэдняй школы, якую закончыла з медалём, — расказвае Інэса.*

*Інэса знаходзіць час і для ўдзелу ў рабоце студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі.*

*— Работа гэта самастойная і вельмі цікавая сама па сабе, акрамя таго, яна дапаможа мне ў маёй будучай прафесіі, — лічыць Інэса.*

*Ну а ў вольны час Інэ займаецца любімай справай — фатаграфіяй. Яна любіць падпільнаваць і спыніць імгненне, адлюстраваць падзею. І яшчэ яна вельмі любіць музыку: класічную і сучасную.*

*— Не ўяўляю свайго жыцця без музыкі, як не ўяўляю яго без матэматыкі. Бывае, ад стомленасці з ног валішся, а паслухаеш музыку, і як бы ўпругое дыханне адкрыецца — яшчэ працаваць можна.*

*— Іна, цяжка вучыцца на адны пяцёркі?*

*— Увогуле, цяжкавата. Часу не хапае катастрафічна...*

*Гэта і зразумела: пяты курс. Апошняя прыступка лесвіцы, якая вядзе ў жыццё.*

*Пяты курс — апошні год вучобы... Год, які пралячыць хутка і непрыкметна. А потым будзе развітанне з універсітэтам, які кожны дзень гасцінна расчыняў дзверы і вучыў. Вучыў не толькі будучай прафесіі, вучыў быць чалавекам.*

*Для мяне універсітэт — не проста навучальная ўстанова, якая дае вышэйшую адукацыю. Універсітэт стаў другім домам, які любіш, па якому сумуеш. Універсітэт — мой добры сябра і настаўнік.*

**Ю. ГУРТОЎЦАВА,**
**наш кар.**

## Мой добры сябра і настаўнік

## ЗАГЛЯНЕМ У ЗАЎТРА

*Зусім недалёкай будучыняй ўяўляецца дзень, калі побач з мікрараёнам «Усход-1» уздоўж Ленінскага праспекта ўзнімуцца новыя карпусы флагмана вышэйшай школы рэспублікі. Форма зайсёды павінна адпавядаць зместу: апошнія дасягненні сучаснага горадабудаўніцтва знайшлі адлюстраванне ў праекце новага комплексу універсітэта.*

*Шматпавярховы галоўны корпус упрыгожвець цэнтральную магістраль беларускай сталіцы.*

*Побач з вучэбна-адміністрацыйным корпусам пайстануць будынкі факультэтаў: механіка-матэматычнага, прыкладной матэматыкі, геаграфічнага, фундаментальнай бібліятэкі, двух інтэрнатаў на 1200 месц кожны. Тут жа размесяцяцца сталовая на 500 месц, школа для асабліва таленавітых дзяцей, стадыён, лёгкаатлетычны манеж, спартыўныя пляцоўкі, плавальны басейн.*

*Планаецца пабудаваць першую чаргу універсітэцкага комплексу ў бліжэйшыя дзве пяцігодкі з улікам апошніх дасягненняў у архітэктуры і будаўніцтве.*

*У другую чаргу ўводзяць карпусы навукова-даследчых інстытутаў прыкладной матэматыкі і прыкладных фізічных праблем, фізіка-хімічных праблем, цэнтр абслугоўвання навуковых даследаванняў, спецыяльнае канструктарска-тэхналагічнае бюро з вопытнай вытворчасцю, карпусы факультэтаў павышэння кваліфікацыі, радыёфізікі і электронікі, хімічнага, біялагічнага, філалагічнага, журналістыкі, гістарычнага, юрыдычнага, міжнароднага вылічальнага цэнтра, а таксама міжнародскі Дом культуры з актавай залай на 1600 месц.*

**НА ЗДЫМКУ:** праект новага універсітэцкага гарадка на Ленінскім праспекце ў Мінску.

## Чалавек неспакойнага шчасця

Л. М. Талстой пісаў: «Калі настаўнік злучае любоў да справы і да вучняў, ён — дасканалы настаўнік». Гэту думку, без сумнення, можна аднесці і да камуніста Вольгі Васільеўны Казловай, дацэнта, загадчыцы кафедры беларускай літаратуры. Праз гады пранесла яна любоў да роднага слова, перадаючы яе сваім вучням.

Размаўляю з Вольгай Васільеўнай на калідоры філалагічнага факультэта. Скупыя промні сонца нясмела блукаюць па сценах, золатам пераліваюцца ў шыбах вялікіх вокнаў. Час ад часу яны заглядваюць Вользе Васільеўне ў твар, і тады вочы яе, уважлівыя і добрыя, яшчэ больш цяплеюць. А можа таму яны загараюцца лагодным святлом, што расказвае яна пра родны факультэт.

У асабістым архіве В. В. Казловай шмат пісьмаў. Самыя розныя яны: з дзяржаўных устаноў і арганізацый, ад рабочых, студэнтаў і школьнікаў, друкаваныя на машынцы і напісаныя акуратным вучнёўскім почыркам, пісьмы-віншаванні, пісьмы-споведзі. І ў кожным — шчырая ўдзячнасць ёй, жанчыне, педагогу, за любоў і павагу да людзей. І калі выпадзе вольная ад работы і хатніх спраў хвіліна, Вольга Васільеўна ў каторы ўжо раз перачытвае дарагія ёй лісты, нібы зноў і зноў перагортвае старонкі свайго жыцця...

У маі 1943 года на станцыі Сходня пад Масквой аднавіў работу Беларускі дзяржаўны універсітэт. Да жаданай перамогі над ворагам былі яшчэ доўгія дні і дні, аднак краіна жыла перспектывай мірнага будаўніцтва, заўтрашнім днём. Ёй патрэбны былі не толькі салдаты, але і будаўнікі, вучоныя, пісьменны. Тады ж, у сорак трэцім, прыйшла ў БДУ і В. Казлова. У дзяўчыны яшчэ не было цвёрдай упэўненасці ў тым, што яе месца іменна тут (хто з маладых не марыў у той час быць лётчыкам ці шахцёрам, да таго ж, быў прыклад — В. Грызадубава і М. Раскова, А. Стаханаў і П. Ангеліна). Аднак першая ж лекцыя, якую чытаў І. В. Гутараў — пазней вядомы вучоны, выдатны педагог, прафесар, — захапіла яе. І Вольга засталася.

Пра студэнцкія гады яна расказвае як аб пары настойлівай вучобы і са**ў**ладання прафесіяй. Словы ж**ы** для фронту, усё для перамогі!» клікалі кожнага савецкага чалавека набліжаць гэты доўгачаканы дзень. Не засталася ў баку і Вольга Казлова: яна перадала сваю стыпендыю на будаўніцтва баявога самалёта.

— А з якой ахвотай вучылася наша пакаленне! Слухалі лекцыі, нарыхтоўвалі дровы, разгружалі вагоны. Ды і дзяўчатам мяшкі з мукою было лёгкімі, бо яны пахлі хлебам. Ніхто не скардзіўся — працавалі за сябе і за тых, хто змагаўся на фронце ці ў партызанскім атрадзе.

У ваенныя гады сям'я Казловых жыла ў гасцініцы «Масква». Да іх часта прыходзілі пісьменнікі, мастакі, кампазітары. Бывалі тут Я. Колас, М. Лынькоў, В. Шышкоў, А. Багатыроў, праслаўленыя партызанскія камандзіры К. Арлоўскі, В. Корж, легендарны дзед Талаш. Размаўлялі аб становішчы на фронце і ў тыле ворага, успаміналі мірны час. Вольга была не толькі слухачом, але і актыўнай удзельніцай гэтых сустрэч. І, безумоўна, расла духоўна, вучылася пераламу асэнсоўваць жыццё.

За гады сваёй педагагічнай дзейнасці Вольга Васільеўна распрацавала і вяла не адзін спецкурс, але найбольш ляжыць у яе душа даспецкурсаў «Праблематыка Вялікай Айчыннай вайны ў беларускай мастацкай літаратуры», «Якуб Колас у школе». Яна выказвоюстае свой багаты літаратурны і жыццёвы вопыт, вопыт сваіх калег — В. А. Захаравай, М. І. Жыркевіча, І. Я. Навуменкі, А. М. Шакуна. Шырокі прастор творчай ініцыятывы, глыбокае веданне літаратуры дазволілі Вользе Васільеўне з поспехам чытаць лекцыі студэнтам-філолагам Сафійскага, Варшаўскага, Ленінскага універсітэтаў, быць кіраўніком некалькіх кандыдацкіх дысертацый.

Перада мной копія пісьма дэкану завочнага факультэта ад былых студэнтаў-завочнікаў філфака, а цяпер настаўнікаў Жабінскай сярэдняй школы Салігорскага раёна Н. Л. Швайко і Л. І. Шырына. Вось некалькі радкоў з яго: «...Мы, былыя выпускнікі, з асаблівай павагай успамінаем выкладчыку беларускай літаратуры Вользу Васільеўну Казлову. Яна сваім майстэрствам і высакароднай любоўю да літаратуры запаліла ў нас той агеньчык, які не гасне ні пры якіх абставінах. Гэта яна навучыла нас разумець усю глыбіню той жыццёвай праўды, якой валодае літаратура нашых народаў, разумець народнасць і партыйнасць яе, яе значэнне для справы выхавання новага чалавека». Лепш, бадай, не скажаш.

**А. ЛАЗОЎСКІ,**
**наш кар.**

● УНІВЕРСІТЭТ У ІХ ЛЁСЕ ● УНІВЕРСІТЭТ У ІХ ЛЁСЕ ● УНІВЕРСІТЭТ У ІХ ЛЁСЕ ● УНІВЕРСІТЭТ У ІХ ЛЁСЕ ● УНІВЕРСІТЭТ У ІХ ЛЁСЕ ●



*Ва універсітэцкіх аўдыторыях і лабараторыях студэнты далучаюцца да навуковага пошуку. Лепшыя з іх папаўняюць рады даследчыкаў. Гонар універсітэта, яго будучае — маладыя вучоныя.*

*На здымку: лаўрэаты прэміі Ленінскага камсамола Беларусі кандыдат фізіка-матэматычных навук І. Р. Гулакой, дацэнт А. Г. Слука, кандыдат фізіка-матэматычных навук С. С. Вятохін.*

Яшчэ да заканчэння сярэдняй школы ў мяне склалася

## ЗДЗЕЙСНЕНАЯ МАРА

цвёрдае рашэнне вучыцца на фізіка-матэматычным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Гэта адбылося, відаць, таму, што найбольшую цікавасць у школе выклікалі ў мяне матэматыка і фізіка. Два старэйшыя бацькавы браты выкладалі фізіку ў сярэдняй школе. Нягледзячы на тое, што вучыўся я ў глухой вясковай мясцовасці на Брэсцяшчыне, да мяне даходзіла слава аб старэйшай вучэбнай установе рэспублікі, аб яе вядомых педагогах, цікавых лабараторыях.

Гэтай мары суджана было здзейсніцца толькі праз чатыры гады пасля таго, як абхадзіў звілістыя партызанскія сцяжыны і доўгія франтавыя дарогі, што прывялі мяне ў Берлін. Вайна не аслабіла, а ўмацавала маё жаданне вучыцца на фізмаце БДУ. І калі пасля дэмабілізацыі ў Савецкай Арміі ў снежні 1945 года я звярнуўся да прарэктара БДУ прафесара М. Е. Макушка з просьбай прыняць мяне на фізмат, ён прапанаваў мне паступаць на іншы факультэт, дзе лягчэй дагнаць курс. Але я настойваў на сваім. Просьбе франтавіка, які з атэстатам выдатніка закончыў сярэднюю школу, ён адмовіць не мог. Так 12 снежня 1945 года я стаў студэнтам фізіка-матэматычнага факультэта БДУ. Гэта вызначыла мой далейшы лёс.

Універсітэт, як і ўвесь горад Мінск, ляжаў у руінах. Уцалеў толькі двухпавярховы цагляны будынак, у якім размяшчаліся рэктарат, фізіка-матэматычны і хімічны факультэты. Нягледзячы на гэта, дзякуючы неймаверным намаганням кіраўніцтва універсітэта і факультэта, былі арганізаваны вучэбны працэс, лабараторныя заняткі.

Пасля заканчэння універсітэта ў 1950 годзе мяне пакінулі для паступлення ў аспірантуру. Уступныя экзамены здаваў у БДУ. Кандыдацкія экзамены па філасофіі і замежнай мове таксама здаў ва універсітэце.

Яшчэ ў час вучобы ва універсітэце выкрышталізавалася жаданне сур'ёзна заняцца оптыкай. Сваім жаданнем я падзяліўся з прафесарам І. Р. Некрашэвічам. Ён адказаў сардэйнічанне ў камандзіраванні мяне ў 1951 годзе для далейшай вучобы ў Ленінград, у аспірантуру Дзяржаўнага Аптычнага інстытута. Але я папрасіў заставацца аспірантам БДУ. Як бачыце, і ў пару станаўлення мяне як навукоўца супрацоўніка вялікую ролю адыграў родны універсітэт.

У час вучобы ў ДАІ высветлілася, што я атрымаў у БДУ дастаткова глыбокія тэарэтычныя веды. Нельга не адзначыць блізкучыя па форме і зместу лекцыі прафесараў Ф. І. Фёдарава і І. Р. Некрашэвіча. І хоць эксперыментальная база Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна ў той час была слабай, неабходны мінімум ведаў і навыкаў у лабараторнай рабоце, дзякуючы вялікім намаганням выкладчыкаў, студэнты атрымлівалі.

Непазнавальна змяніўся з той пары наш універсітэт. У юбілейным годзе хачу пажадаць калектыву слаўнага універсітэта новых вяліх дасягненняў у вучэбнай і навукова-даследчай дзейнасці.

**М. БАРЫСЕВІЧ,**
**прэзідэнт Акадэміі навук БССР, акадэмік АН СССР, Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій СССР.**



стагоддзя ва універсітэце была плённай для маёй навуко-

## Ганаруся табой, УНІВЕРСІТЭТ!

У сярэдняй школе ў мяне зарадзілася мара стаць фізікам. Першым крокам да таго, здавалася, быў выбар факультэта прыкладной матэматыкі, пасля чаго гэтай навукі была вучоба ў Ленінградскім універсітэце.

З 1956 года я выбраны акадэмікам АН БССР, у тым жа годзе пераехаў у Мінск. У гэтыя студзеньскія дні спаўняецца дваццаціпяцігоддзе маёй работы ў БДУ імя У. І. Леніна. Мне пашчасціла, што я працую побач з выдатнымі вучонымі кафедры ядзернай фізікі і мірнага выкарыстання атамнай энергіі. Іменна таму чвярць вякоў і выкладчыцкай дзейнасці.

Калі правесці паралель паміж сённяшнімі студэнтамі і студэнтамі майго пакалення, то заўважаеш шмат агульнага. І у першую чаргу — гэта імкненне стаць сапраўднымі спецыялістамі. А працаваць з моладдзю для мяне заўсёды прыемна.

**М. ЕЛЬЯШЭВІЧ,**
**лаўрэат Ленінскай і Дзяржаўных прэмій СССР, прафесар кафедры ядзернай фізікі і мірнага выкарыстання атамнай энергіі, акадэмік АН БССР.**

## РЭАЛІЗАВАЦЬ МАГЧЫМАСЦІ

Першая мая навуковая работа была зроблена на кафедры тэарэтычнай фізікі з мэтай растлумачыць эксперыментальныя вынікі, атрыманыя ў вопытах прафесара І. Р. Некрашэвіча. У той час я быў яшчэ чацвёртакурснікам. Затым, аднак, навуковыя інтарэсы змяніліся — больш зацікавілі праблемы многіх цел у квантавай тэорыі поля, і ў аспірантуру я ўжо размеркаваўся на кафедру ядзернай фізікі.

Прыемна адчуваць, што праблемам гэтым, звязаным з развіццём навуковага напрамку, што ўзнік у сувязі з адкрыццём з'явы ядзернай прэцэсіі нейтронаў, якое зарэгістравана Дзяржаўным Камітэтам Савета Міністраў СССР па справах вынаходніцтваў і адкрыццяў пад нумарам 224, кіраўніцтва універсітэта надае вялікае значэнне. Гэта патрабуе ад нашага калектыву яшчэ большай адказнасці.

Напэўна, для кожнага з нашых выпускнікоў асабліва важная ўсёбаковая адукацыя, упэўненае валоданне як тэорыяй, так і сродкамі навуковай творчасці. А магчымасці для атрымання значнай тэарэтычнай базы наш БДУ стварае выдатныя. Трэба толькі смялей брацца за складаную працу вучонага і не забываць, што новы погляд на старыя і, здавалася б, вядомыя рэчы часам аказваецца важней новай формулы ці якога-небудзь новага канкрэтнага факта.

**В. БАРЫШЭЎСКІ,**
**прафесар, аўтар першага адкрыцця ў гісторыі ВНУ Беларусі.**

# Прафесар Праца

З мноства разнастайных дакументаў у музеі універсітэта запомніўся адзін. Пажоўклы ад часу, складзены ліст паперы. Камсамольская пуцёўка Уладзіміра Бабкова — студэнта пяцідзесятых гадоў. Разам са сваімі таварышамі ён накіроўваўся на ўборку цаліннага ўраджаю ў час летніх канікулаў. Запомніўся, магчыма, не толькі таму, што нас яднаюць высокія парывы маладосці. Валодзя стаяў каля вытокаў студэнцкіх аб'яднанняў, якія сёння называем будатрадамі. Ён пачынаў, мы працягваем...

Кустанайская вобласць. Камышынскі раён. Сюды адправіліся 264 студэнты універсітэта ў 1956 годзе. Першае месца дыслакацыі. Тады нават слова такога не было ва ўжытку студэнтаў. Гэта потым прыйдуць і назвы, і традыцыі, і ветэраны... Пачатак пачаткаў. І ўсё значылася ўпершыню: першая лінейка, лекцыя, канцэрт...

Лета за летам пісалася біяграфія будатрадаў універсітэта. Упэўнена, перакана. Знаёмішся са старонкамі гісторыі і міжволі заўважаеш, што быццам знаёмішся з фільмам.

**Кадр першы.**

**...Імклівa набірае сваю вышыню філфакаўскі «Буравеснік». Першы СБА БДУ, які заключыў доўгатэрміновы дагавор з прымаючай арганізацыяй. З 1971 па 1975 гады на меліярацыі беларускага Палесся «Буравеснікам» асвоена 323,5 тысячы рублёў капіталаўкладанняў. Рукамі байцоў пракладзена больш 50 кіламетраў меліярацыйнага канала.**

**Кадр другі.**

**...Універсітэцкія атрады аднымі з першых узялі курс на легендарную Рудабелку. Партызанскі край аб'яўлены ЦК ЛКСМ Беларусі падшэфнай зонай рэспубліканскага зводнага будатрада. Фронт работ — ударны. Памятныя паходы па мясцінах баявой славы. Разам са студэнтамі — былыя партызанскія праваднікі...**

Цяпер ва універсітэце нікога не здзівіш і бамаўскай «прапіскай» СБА. Хаця паехаць туды не кожнаму выпадае. Адпраўляюцца лепшыя.

Як сваіх добрых знаёмых сустракаюць юнакоў і дзяўчат з Белдзяржуніверсітэта на Пскоўшчыне, у Казахстане, Карэліі. Сюды выязджаюць дзесяткі атрадаў. Многія з іх, як «Ветразь», імя Купрыянава, замацавалі свае дзелавыя сувязі доўгатэрміновымі дагаворамі. Вынік: кожны семестр яны ў ліку лепшых. У пачатку 70-х з доўгатэрміновым дагаворам быў толькі адзін атрад. Зараз — каля трыццаці. Крок наперад. І значны.

У 70-х адкрываюцца старонкі біяграфіі інтэратрадаў. «Сябры», напрыклад, праводзілі свой семестр на будаўніцтве Усць-Ілімскага лесапрамысловага комплексу, будоўлі краін — удзельніц Савета Эканамічнай Узаемадапамогі. А на гістфаку могуць бясконца расказваць пра інтэратрад імя Гарыбальдзі, байцамі якога з'яўляюцца в'етнамцы, немцы, кубінцы, чэхі. СБА «Мінск» штогод выязджае працаваць у ГДР. Да нас — атрад з Іенскага універсітэта.

Студэнцкая будоўля нараджала і сваіх герояў. З гонарам называюцца імёны А. Слукі, М. Цівы, А. Калесніка, Л. Семяненкі, В. Прокашавай... Былы студэнт фізфака Леанід Семяненка — першы ардэнаносец універсітэцкага атрада. Нядаўна новыя байцы адзначаны ўрадавымі ўзнагародамі — В. Малафееў, Л. Буцалева, В. Шландыкаў. Універсітэцкі зводны будатрад — чацвёрты год запар адзін з правафланговых сярод СБА ВНУ рэспублікі. Пачэснае званне, але яшчэ адказней штогод яго апраўдваць.

Студэнт-будатрадавец, выхаванец універсітэта, ты пакідаеш аб сабе добрую памяць у час сваіх летніх семестраў. Твой дом, твая школа, дарога і страла меліярацыйнага канала, твая сапраўды шматгранная грамадска-палітычная работа будуць па-добраму напамінаць аб табе людзям. Ты заслужыў сваё «выдатна» ў працоўнай залікоўцы. Хочацца моцна паціснуць табе руку і сказаць: «Дзякуй за пабудаваную вуліцу, асушаныя балоты Палесся, за памяць і абавязак перад героямі»!

**П. АКСЮЧЫЦ,**
**удзельнік пяці працоўных семестраў, кавалер ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга.**

# ставіць «выдатна»!

літаратурная старонка

# РУНІЦОВЫ РАНАК

# Сэрцам прапісаныя

У вядомага беларускага паэта, лаўрэата Літаратурнай прэміі імя Я. Купалы, выпускніка БДУ імя У. І. Леніна 1949 года Міколы Аўрамчыка ёсць звонкія, натхнёныя радкі:

Быў прапісаны і жыў
не госцем
Ва Універсітэцкім гарадку.

Колькі сёння людзей ва ўсім Савецкім Саюзе, не кажучы ўжо пра Беларусь, можа паўтарыць, паўтарае гэтыя словы! А што, ва універсітэце былі прапісаны — у сценах яго вучыліся, у інтэрнатах жылі ледзь не ўсе сённяшнія літаратары Беларусі. Сярод першых студэнтаў універсітэта былі Кузьма Чорны і Паўлюк Трус. Першымі з першых студэнтаў універсітэта сталі народнымі пісьменнікамі і паэтамі БССР Кандрат Крапіва, Пятрусь Броўка, а славу беларускай літаратуры 20—30-х гадоў памножылі ці памнажаюць Пятро Глебка, Максім Лужанін, Ян Скрыган, Адам Бабарэка, Андрэй Александровіч, Алесь Звонак, Алесь Якімовіч, Мікола Хведаровіч, Алесь Пальчэўскі.

Лаўрэатамі Ленінскай прэміі сталі два выпускнікі універсітэта — Пятрусь Броўка і Іван Мележ. Універсітэт ганарыцца і пасляваеннай плеядай беларускіх пісьменнікаў, якіх ён выхаваў і сярод якіх лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Коласа, акадэмік АН БССР, дырэктар Інстытута Літаратуры імя Я. Купалы АН БССР Іван Навуменка, член - карэспандэнт АН БССР Алесь Адамовіч. Першым сакратаром СП БССР нядаўна стаў прафесар універсітэта, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Купалы, паэт Ніл Гілевіч, а даўно ўжо ў апараце СП БССР сакратарамі працуюць лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Коласа, вядомы празаік Іван Чыгрынаў, лаўрэат прэміі імя І. Мележа Вячаслаў Адамчык, Анатоль Вярцінскі і Барыс Сачанка. Спіс лаўрэатаў—выпускнікоў універсітэта — можна прадоўжыць, бо імі ўжо сталі Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Іван Пташнікаў, Янка Сіпакоў, Васіль Зуёнак, Вольга Іпатава, Яўгенія Янішчыц. Слава беларускай літаратуры—гэта сапраўды заслужаная слава і нашага універсітэта, а самой гісторыі універсітэта не адарваць ад гісторыі беларускай літаратуры.

Што гэта так, можна адчуць і з сённяшняй літстаронкі, якая, вядома, не магла змясціць творы больш чым 150 паэтаў — выпускнікоў універсітэта, але ўсё ж пэўную гістарычную панараму літаратурнага жыцця пасляваеннага універсітэта, несумненна, дасць.

Пачалі мы вершамі Міколы Аўрамчыка, словы з таго ж верша просяцца і ў заканчэнне:

Ведае
мой не адзін равеснік,
Што Універсітэцкі гарадок
У маім жыцці —
нібыта ў песні
Новы загаловачны радок.

**Алег ЛОЙКА.**

---

**Мікола АЎРАМЧЫК,**
**выпускнік 1949 года**

## Універсітэцкі гарадок

Ведае
мой не адзін равеснік,
Што Універсітэцкі гарадок
У маім жыцці —
нібыта ў песні
Новы загаловачны радок.

Тут пачаў я штурмаваць
навуку,
Калі ўжо фашысты не крадком
Авалодалі ў Мадрыдзе брукам
І Універсітэцкім гарадком.
Думаў я,
што ачумелы вораг
Быў тады на свеце не хадок
У далёкі гэтакі мой горад
І Універсітэцкі гарадок.

Ажно і сюды дабраўся з часам
Ён праз папялішчы ды палын...
І ў падвале корпуса наргаса
Нашым аднакурснікам былым
Заганяў гарачыя іголкі
Пад пазногці тонкіх пальцаў іх,
Што, бывала, адвячоркам
золкім
Сагравалі мы ў руках сваіх.
Давялося кроў праліць да
кроплі
Дружбаку майму не аднаму,
З універсітэтаў у Еўропе
Выпякаючы агнём чуму.
За паўсвету,
з актавае залы,
Як і ў даваенныя часы,
Незабыўных
Коласа й Купалы
Чуліся жывыя галасы.
Ад маёй душы вайна трагічна
Аддзяліла мой юнацкі свет
І мой інстытут педагагічны
Ад цябе,
мой універсітэт.
Хоць наш корпус
зараз не галоўны,—
Кожны твой закутак і грудок
Неаддзельны ад мяне ўсё
роўна,
Універсітэцкі гарадок.

У твае разбураныя сцены
Цэглу клаў я з дружбаком
сваім.
І ў даведніках пасляваенных
Значыўся па адрасе тваім.
Лёс мой склаўся так,
што з маладосцю
Усё жыццё ішоў я пад руку...
Быў прапісаны
і жыў не госцем
Ва Універсітэцкім гарадку.

***

Відаць,
прарэктар быў паэтам,
Калі на нарачанскі плёс
З двара свайго ўніверсітэта
Стары барак наш перавёз.
Там,
дзе ад вокан выдавецкіх
Сквер загароджваў ён сцяной,
У гарадку ўніверсітэцкім
Астаўся толькі рад кляноў.
Клён з галіной адпілаванай,
Што засціла ў акне святло,
Нагадвае,
дзе захавана
Было калісь маё жытло.

Не дзеля выпівак і складчын
Не раз заглядвалі сюды
Ваеннай справы наш
выкладчык,
Палітработнік малады,
Што меў кар'еру і цвярозасць,
Мог мець чыны не без падстаў,
А ўзяў ды генералам прозы
У літаратуры нашай стаў;
І аспірант худы,
танклявы,
Які стаў доктарам навук...
Ён ад навукі
і ад славы
Пасля ажно сагнуўся ў крук.

Тут,
адсобіўшыся ў келлі,
І раніцою, і ўначы
Студэнт ціхмяны,
як пустэльнік,
Карпеў бог ведае над чым.
А потым неўзабаве
мігам
Нашчадак сельскіх урачоў
Заваяваў сваёю кнігай
Па ўсёй краіне чытачоў.

Узяўшы кацялкі ці чайнікі,
Чаргу займалі ў кубавой
І радавыя, і начальнікі:
Дацэнт-гісторык, сябра мой;
Студэнт, эстэтыкі аматар;
Сусед, хімкорпуса вахцёр;
Сам аўтар роднае граматыкі;
Машыны рэктарскай шафёр.
А кубаўшчыца,
печцы чаднай
Шкадуючы казённых дроў,
Дзяліла кіпецень ашчадна
На ўсіх барачных жыхароў.

І саграваў нас,
небаракаў,
Крыху прапахлы дымам вар...
Хвала студэнцкаму бараку —
Прытулку нашых дум і мар!
Студэнтаў іншых
ён на Нарач
Цяпер прывабліва заве,
Як параход з катлом пад
парай,
Што ў край рамантыкі плыве.

1967 г.

---

*Пасяджэнне студэнцкага творчага аб'яднання «Узлёт» вядзе член Саюза пісьменнікаў БССР, паэт, прафесар кафедры беларускай літаратуры А. А. Лойка.*

---

**Уладзіслаў НЯДЗВЕДСКІ,**
**выпускнік 1949 года**

## ГВАРДЗЕЕЦ НАВУКІ

Пажарам той вечар палаў
Над горадам родным
і блізкім —
Пяхота рабіла прывал,
Апошні прывал перад Мінскам.

Назаўтра заззяла зара
Агністым святлом непаўторным.
І ў ліпеньскі ранак «ура!»
Як гром, скалыхнула прасторы.

...І тут, дзе цяпер гарадок
Красуецца універсітэцкі,
Прысвоілі роце яго
Высокае званне гвардзейскай.

Адходзіла рота ў паход,
Грымела гарматамі лета...
Вярнуўся гвардзеец праз год
У сцены універсітэта.

Вучобу закончыў і ўзяў
Значок свой універсітэцкі.
На грудзях ягоных заззяў
Значок гэты побач
з гвардзейскім.

Сягоння гвардзейцу ісці
Адсюль не ваенным паходам —
Сягоння гвардзейцу нясці
Адсюль свае веды народу.

Любімай Радзіме аддаць
Сваю маладосць, свае рукі
І з чэсцю імя апраўдаць
Гвардзейца савецкай навукі.

1951 г.

---

**Уладзімір МАРУК,**
**выпускнік 1980 года**

## МАЦІ

Пагрукаю я, пагрукаю
У сонных акон смугу,
А нехта ў шыбу хукае,
Валёнкі бярэ на бягу.

Нястрымана дзверы рыпнулі.
Сабака, як злодзей, змоўк.
Як месячык, бровы выгнула
І вымавіла: «Сынок!

Ну, як ты цяпер з навукаю?»
А я паўтару ўсяго:
Я грукаю, мама, грукаю
У вокны жыцця свайго.

1976 г.

---

**Рыгор БАРАДУЛІН,**
**выпускнік 1959 года**

***

Дзень добры, інтэрнат — стары
знаёмы,
Вясёлая студэнцкая радня!
Зноў важыць чамадан лягчэй,
чым дома,
Зноў дабаўляем дзірак у
рамнях.
За лета шмат пытанняў не
рашылі —
Па вечарах дыскусія кіпіць.
Над кнігай чайнік, выцягнуўшы
шыю,
Нібы гусак, разгневана
шыпіць...

Зноў, любы інтэрнат, да
позняй ночы
Струменіцца святло з тваіх
акон —
Так свецяцца ад шчасця
ў бацькі вочы,
Калі сваіх сыноў сустрэне ён.

1956 г.

---

**Яўгенія ЯНІШЧЫЦ,**
**выпускніца 1971 года**

***

Будуць вёсны і пралескі...
Будзе радасць і туга.
Адцвіце вясна на ўзлеску,
Пабяжыць за сіні гай.
І хваёваю ігліцай
Адзавецца лета звон.
Толькі мне не паўтарыцца
Ні вясною, ні зімой.
Столькі думак — самых
шчырых! —
Светлы шлях, мне пажадай.
Заўтра будзе сіні вырай
І бясконцы небакрай.
Будзе лета з навальніцай
І вясёлка над ракой.
Толькі мне не паўтарыцца
А ні летам, ні зімой.

1966 г.

---

*Кнігі твораў студэнтаў універсітэта.*

# ІМ КРЫЛЫ ДАЕ МАЛАДОСЦЬ

Маладыя вучоныя універсітэта — гэта звыш 1200 выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў, інжынераў і аспірантаў ва ўзросце да 33 гадоў. Сярод моладзі сёння 148 кандыдатаў навук, яны займаюць пасады загадчыкаў кафедр (напрыклад, А. А. Бандарэнка, Я. В. Радына), загадчыкаў лабараторый (напрыклад, В. Б. Таранчук, А. А. Мінько, І. Р. Гулакоў і іншыя), уваходзяць у кіраўніцтва факультэтаў і навуковых падраздзяленняў універсітэта.

У апошнім конкурсе на атрыманне прэміі Ленінскага камсамола Беларусі ўдзельнічала 7 работ, якія былі выкананы ў БДУ імя У. І. Леніна ў галіне журналістыкі, навуковага камунізму, матэматыкі, фізікі і навуковага прыладабудавання, дзвюм з гэтых работ высокая узнагарода была прысуджана. Належыць падкрэсліць, што маладыя вучоныя універсітэта ўдзельнічалі ва ўсіх конкурсах на атрыманне прэміі ЛКСМБ Беларусі і ва ўсіх заваёўвалі гэту ўзнагароду. За пяцігодку супрацоўнікамі універсітэта абаронена 250 кандыдацкіх дысертацый, 23 маладыя навуковыя супрацоўнікі сталі лаўрэатамі рэспубліканскіх і ўсесаюзных аглядаў-конкурсаў, 69 — лаўрэатамі універсітэцкага агляду-конкурсу навуковых работ маладых вучоных. На рахунку маладых 252 вынаходніцтвы, 10 медалёў ВДНГ СССР, 34 медалі ВДНГ БССР.

**А. ПАТРЫН,**
**старшыня савета маладых вучоных, дацэнт.**

# КАМУНІСТЫ ФІЗІЧНАГА

Авангардам шматтысячнага калектыву супрацоўнікаў і студэнтаў нашага універсітэта з'яўляецца партыйная арганізацыя, якая аб'ядноўвае звыш 1700 камуністаў. Адно з яе звенняў — пярвічная партыйная арганізацыя фізічнага факультэта. У яе радах каля 120 камуністаў.

Радуюць вынікі выканання сацыялістычных абавязацельстваў у 1981 годзе. Супрацоўнікамі і аспірантамі факультэта абаронена 15 кандыдацкіх дысертацый, выйшлі з друку 4 манаграфіі, падручнікі, адпраўлена ў друк звыш 350 навуковых артыкулаў, у тым ліку 50 у сааўтарстве са студэнтамі.

Паслана 80 заяў на вынаходніцтвы і атрымана каля 60 станоўчых рашэнняў. Эканамічны эфект ад укаранення распрацовак па гасдагаворнай і дзяржбюджэтнай тэматыцы склаў звыш 4 млн. рублёў. Студэнтамі факультэта зроблена 418 дакладаў на навуковай канферэнцыі факультэта. Да ўкаранення рэкамендавана 147 дыпломных работ выпускнікоў 1981 года. Факультэтам заключана 18 дагавораў аб вучэбным і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве. Лідзіруюць у сацыялістычным спаборніцтве кафедры фізікі паўправаднікоў, агульнай фізікі і тэарэтычнай фізікі.

Мы ганарымся нашымі ветэранамі Героем Савецкага Саюза А. В. Кірсанавым, Я. А. Піскуновым, М. І. Марэнка, Г. В. Шыбаевай, І. Т. Рагоўскім, якія ўсё сваё жыццё прысвяцілі універсітэту.

Аб педагагічным майстэрстве, вопыце Г. С. Кемброўскага, А. А. Чупрыгіна, М. А. Ельяшэвіча памятае кожны. Можна падобраму пазайздросціць арганізатарскаму таленту камуністаў Э. М. Шпілеўскага, М. М. Полазава, Н. А. Пракошынай, І. У. Якіменка.

**Н. ХАЎРАТОВІЧ,**
**сакратар партбюро фізфака.**

У пачатку любога пачынання стаяць энтузіясты. Так было і ў нас. 60 гадоў назад выкладчыкі фізвыхавання Н. Дарафеева, Я. Камароўскі і Т. Палянскі адкрылі курсы фізкультуры пры спецкафедры. Гэта была толькі спроба. Пастаянны курс фізічнага выхавання.

У верасні 1948 года ва універсітэце ствараецца кафедра фізічнага выхавання. Першыя яе секцыі: лыжная, лёгкаатлетычная, гімнастыкі.

У 1957 годзе быў арганізаваны спартыўны клуб, які адыгрывае вялікую ролю ў спартыўным жыцці універсітэта.

Спартсмены БДУ ўнеслі значны ўклад у спартыўныя поспехі не толькі ў рэспубліцы, але і ў краіне. У. Гараеў, былы студэнт хімфака, зараз кандыдат хімічных навук, заваяваў сярэбраны медаль у трайным скачку на Алімпійскіх гульнях у Рыме ў 1960 годзе. А на Алімпійскіх гульнях у Манрэалі гонар краіны абараняла студэнтка юрыдычнага факультэта Таццяна Бойка-Шляхто. У чэрвені 1956 года на першынстве СССР у Кіеве студэнтка юрфака Вольга Кошалева паўтарыла рэкорд краіны ў бегу на 100 метраў з вынікам 11,6 секунды. І ў гэтым жа годзе яна прымае ўдзел у XVI Алімпійскіх гульнях у Мельбурне. Нашы спартсмены неаднаразова станавіліся чэмпіёнамі свету, Еўропы і Савецкага Саюза. Назавём толькі імёны экс-чэмпіёна свету па шашках А. Гантварга, чэмпіёнкі свету і Еўропы, рэкардсменкі кантынента па водных лыжах І. Потэс, удзельніцы XXI Алімпійскіх гульняў Л. Кайгародавай, першага майстра спорту СССР міжнароднага класа па лёгкай атлетыцы ў БССР А. Котава, мацнейшага шахматыста рэспублікі гросмайстра В. Купрэйчыка, чэмпіёнкі VII летняй Спартакіяды народаў СССР Н. Шаўчэнкі і выкладчыка кафедры фізвыхавання і спорту У. Фралова, які стаў на гэтай спартакіядзе ўладальнікам сярэбранага медаля ў гонцы на яхце ў класе «Зоркавы».

Неаднаразовымі чэмпіёнамі першынстваў Беларусі сярод ВНУ з'яўляюцца каманды нашага універсітэта па баскетболу (трэнер В. Е. Шхіньян), футболу (трэнер В. Д. Ліштван), валейболу (трэнер В. М. Кучынскі), цяжкай атлетыцы (трэнер В. Ф. Каралёў), гімнастыцы (трэнер В. В. Сеўба), лыжах (трэнер Л. А. Капылова), плаванню (трэнер М. Ф. Кузьмянкоў), лёгкай атлетыцы (трэнеры М. А. Жаўнерка і В. В. Зарэцкая.

*Мастацкая гімнастыка — адзін з любімых відаў спорту студэнтак.*

# І рэкорды, і здароўе

Сістэматычныя заняткі спортам не абавязкова вядуць да высокіх чэмпіёнскіх званняў. Любоў да фізкультуры застаецца на ўсё жыццё. Многія выпускнікі універсітэта, цяпер вядомыя вучоныя, дабіваліся значных поспехаў у спорце.

Дырэктар Інстытута матэматыкі АН БССР У. П. Платонаў у студэнцкія гады нядрэнна гуляў у баскетбол і выступаў за універсітэцкую зборную. Рэктар БПІ, прафесар В. Д. Ткачоў займаўся спартыўнай гімнастыкай, прафесар А. С. Фядэнка паказваў высокія вынікі ў горным турызме. Двойчы майстрам спорту па класічнай барацьбе і турызму быў кандыдат фізіка-матэматычных навук А. Б. Антаневіч. І такіх прыкладаў можна прывесці шмат.

Але не толькі ўчарашнім жыве наш універсітэт. Спортклуб і кафедра фізвыхавання і спорту з'яўляюцца арганізатарамі многіх спартыўна-масавых мерапрыемстваў. Развіццём фізкультуры і спорту займаюцца вопытныя людзі. Так, на кафедры сёння працуе 56 выкладчыкаў, з іх 3 майстры спорту СССР міжнароднага класа.

За мінулы год падрыхтавана 4 майстры спорту СССР, 29 кандыдатаў у майстры спорту, сотні першаразраднікаў, тысячы спартсменаў масавых разрадаў, больш дзвюх з палавінай тысяч значкістаў ГПА.

**Н. КРОЙТАР,**
**старшыня спортклуба, майстар спорту СССР міжнароднага класа, чэмпіёнка СССР па лёгкай атлетыцы.**

# МУЗЕ ВЕРНАЕ СЛУЖЭННЕ

**Кожны верасень — новы пачатак. Не толькі пачынаецца новы навучальны год, але і новы канцэртны сезон. Фарміруюцца калектывы мастацкай самадзейнасці — духавы аркестр, агітбрыгада, тэатр мініяцюр, ВІА, народны аркестр народных інструментаў і іншыя (усяго ва універсітэце іх — 10), уходзяць «старыя», улiваецца маладое папаўненне. Каля чатырох тысяч чалавек аддаюць свой вольны час творчасці, мастацтву.**

...Зачыненыя дзверы ніяк не хацелі выпускаць чароўныя гукі, якія ліліся з аўдыторыі. Не, гэта была ні «Авэ, Марыя», ні бахаўскія інвенцыі, гэта была звычайная гама. Але здавалася, што гучаў шматгалосы хорал. Гама называлася распеўкай.

— Сапрана, калі ласка. Цішэй, дакладней...— Ігар Гаўрылавіч Мацюкоў дае патрэбную ноту і—зноў і зноў паўтараецца па кавалачках твор. І вось, нарэшце, чатырохгалоссе гарманічна зліваецца, і нібыта адзін стройны акорд гучыць у цішыні.

— Што прыцягвае нашых сяброў іменна сюды, а не ў папулярныя зараз эстрадныя калектывы? Напэўна, адказ просты: любоў да спеваў,— гаворыць малады кіраўнік.— Капэла аб'ядноўвае каля 50 чалавек, яе састаў пастаянна мяняецца. Але я ўпэўнены, што, развіваючыся з нашым калектывам, юнакі і дзяўчаты не развіваюцца з музыкай і, дзе б яны ні знаходзіліся, усюды будуць працягваць спяваць.

А ў другой зале, на сцэне народнага студэнцкага тэатра, ідзе карпатлівая работа над п'есай В. Кандрацьева «Водпуск па раненню». Атмасфера 40-х гадоў захапіла рабят. Яны ўдумліва працуюць над творам, вывучаюць прыкметы ваеннага часу, па крупінках збіраюць матэрыял, каб паўней ужыцца ў вобраз. Другая п'еса, якую рыхтуюць артысты — «Яшчарка» А. Валодзіна,— працягвае пачатую тэатрам у спектаклі таго ж аўтара «Дзве стралы» тэму філасофскага асэнсавання жыцця. Па сцэнарыю асноўную ролю ў творы іграюць сцэны-дыялогі, але

немалаважнае значэнне маюць тут і рухі, танцы. Таму такая сур'ёзная ўвага ўдзяляецца пластыцы, гібкасці, рабоце над сваім целам, рухамі.

Першыя крокі робіць толькі што створаная ў БДУ студыя пантамімы, з задавальненнем і самабытна спяваюць меладычныя беларускія народныя песні ўдзельнікі універсітэцкай фальклорнай групы, з нязменным поспехам праходзяць канцэрты шырока вядомага гледачу народнага ансамбля народнага танца «Крыжачок». Творчасць, мастацкая самадзейнасць дазваляе студэнтам дакрануцца да свету прыгожага.

**І. САВЕТКІНА,**
**наш кар.**

*На здымку: выканаўчае майстэрства «Крыжачка» вядома ў нашай краіне і за мяжой.*

**Вось і ўсё, паважаны чытач! Сціслыя рамкі газетных старонак не могуць умясціць усю гісторыю слаўнага шляху БДУ, не дазваляюць расказаць аб усіх яго дасягненнях, аб працавітых вучоных і педагогах, аб таленавітым студэнцтве. Прачытанае табой — маленькая кропля з таго, што ўяўляе універсітэт сёння.**

**Выкладчык, супрацоўнік, студэнт заўтрашніх дзён! Ты будзеш, мы верым, лепш вучыцца, лепш працаваць, лепш жыць. Кожнае пакаленне павінна, абавязана быць лепшым, больш дасканалым. Інакш — навошта яно! Мы верым, ты возьмеш усё лепшае з 60-гадовага вопыту, удасканаліш яго і пойдзеш далей, да новых вышынь навукі, адукацыі, культуры. Толькі так!**

**Рэдактар**
**В. П. ВАРАБ'ЁЎ**

«Беларускі універсітэт». ● 8 стар. ● Наш адрас: 220080, Мінск, Універсітэцкі гарадок. ● Друкарня выдавецтва ЦК КПБ. ● Зак. 55. ● АТ 02014 ● 12.1.82 г.